

МАСТАЦТВА ЗНОЎ ВЫХОДЗІЦЬ НА ВУЛІЦЫ 8

ГАЛОЎНЫ ІДЭОЛАГ... ЁН ЖА — СЯБАР ЛУЧАНКА 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 МАЯ 2019 г. СУБОТА № 83 (28950)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Важна, развіваючы вытворчасць на сяле, ствараць неабходныя ўмовы і ў сацыяльнай сферы для таго, каб і моладзь, і ўсе вяскоўцы мелі магчымасць схадзіць у кіно, прыйсці ў клуб і займацца па інтарэсах — танцамі, удзельнічаць у харавых калектывах. Для чалавека, яго самарэалізацыі павінны быць створаны ўсе ўмовы. Толькі ў комплексе можна стварыць вёску будучыні. Апошнім часам усё больш прыкладаў, калі людзі з'язджаюць з вялікіх гарадоў жыць у невялікія сельскія раёны, працуюць у сельскагаспадарчых прадпрыемствах, а дзесьці і самі адкрываюць аграэкасядзібы, ствараюць фермерскія гаспадаркі. Гэта выдатна, калі чалавек можа сябе рэалізаваць, знайсці прымяненне сваім сілам, а таксама жыць у больш спакойным рытме».*

## КОРАТКА

• У Беларусі ўдакладнены парадак праходжання ваеннай службы і службы ў рэзерве.

• **Пенсіі і дапамогі за 7 мая пачнуць выплачваць з 4 мая ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі краіны. Выплата пенсій за 9 мая пачнецца ў АПС Мінска з 4 мая, у астатніх АПС — 8 мая.**



• Колькасць памежнікаў на загружаных напрамках павялічаць падчас доўгіх выхадных.

• **Абласныя радзільныя дамы забяспечаць гінекалагічнымі крэсламі для жанчын з інваліднасцю.**

• Кветкі на вадзе ўпрыгожаць Мінск да II Еўрапейскіх гульняў.

ISSN 1990 - 763X

# ЛЁГКАГА ЎЗЛЁТУ, МЯККАЙ ПАСАДКІ

**Прэзідэнт адкрыў другую ўзлётна-пасадачную паласу ў Нацыянальным аэрапорце**

**Сімвалічную стужку перарэзалі кіраўнік дзяржавы, міністр транспарту і камунікацый Аляксей Аўраменка і генеральны дырэктар Нацыянальнага аэрапорта Мінск Дзмітрый Мелікян.**

На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пытанне аб будаўніцтве яшчэ адной узлётна-пасадачнай паласы паўстала даўно, паколькі цяперашняя ўжо не вытрымлівае нагрузак — напрыклад, яна не можа прымаць велікагрузныя лайнеры.

Беларускі лідар расказаў, што калі было прынята рашэнне аб будаўніцтве новай паласы, многія спецыялісты пераконвалі яго, нібыта самастойна гэта зрабіць не пад сілу. «Мы ніколі не будавалі гэтых палос — і трэба мець справу з сусветнага ўзроўню фірмамі. Вядомымі фірмамі, якія прыедуць, нам пабудуюць», — адзначыў ён.

І вось, калі пагадненне аб будаўніцтве — з сусветнага ўзроўню фірмай — было практычна заключана, кіраўніку дзяржавы прынеслі на подпіс дакумент — і там у цане значылася лічба за 600 млн долараў. «Я сказаў: тады не трэба нам гэтая паласа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# МАЗЫРСКАЯ ЖАР-ПТУШКА



Рэзчык па дрэве пры Мазырскім вопытным лясгасе Аляксандр ЗЯНЬКО *(на фота справа)* выразае фігуры звяроў і птушак пры дапамозе бензапілы. А з дапамогай агню надае сваім творам адмысловы выгляд — «пад даўніну». Нядаўна ў гарадскім парку Аляксандр даваў майстар-клас і дэманстраваў сваю тэхналогію — як звычайную калодку ператварыць у знаёмы з дзяцінства вобраз. Майстру на ягоным «пленэры» дапамагаў лясгасаўскі аўтаслесар Артур СЕМЯНЦОЎ — выпіленага драўлянага арла яны «фарбавалі» менавіта агнём.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Спажывец

# І цукерка можа выклікаць шок

**Карэспандэнт «Звязды» высвятляў плюсы і мінусы салодкай прадукцыі**

**Першым жаданнем пасля размовы са спецыялістамі было пачысціць шуфлядку рабочага стала. Я вялікая ласуха, працаваць без смакаты мне наогул нецікава. Закінула ледзянец у рот — і жыццё напаўняецца іншым сэнсам. Але цукеркі — гэта не толькі гармон задавальнення. Гэта... Лепш паслухаем экспертаў.**

СТАР. 11

# «ЗАЛАТАЯ ЛІТАРА» Ў КВАДРАЦЕ



**Учора ўвечары прайшло кульмінацыйнае мерапрыемства выстаўкі «СМІ ў Беларусі» — былі падведзеныя вынікі XV Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара».**

У «Звязды» гэтым разам дзве ўзнагароды найвышэйшай пробы — газета стала пераможцай у намінацыі «Найлепшыя матэрыялы сацыяльна-эканамічнай тэматыкі», а спецыяльны карэспандэнт Дар'я Лабажэвіч — у намінацыі «Найлепшы рэпарцёр рэспубліканскіх, абласных друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў». Таксама «Звязда» са сваім пастаянным праектам «Краіна здароўя» стала лаўрэатам у намінацыі «Найлепшыя матэрыялы па тэматыцы спорту і здаровага ладу жыцця».

Віншуем усіх, хто прычыніўся да перамогі, і, канешне, чытачоў «Звязды». Бо ўсё, што мы робім, мы робім для вас і з вашай несумненнай падтрымкай.